Мінск, 10 лютага 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Шчыра віншую Вас з нагоды 25-й гадавіны ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Карэя.

Вынікам плённага ўзаемадзеяння стала значнае пашырэнне двухбаковых кантактаў, у тым ліку візітаў і сустрэч на розных узроўнях прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і ўстаноў, дзелавых колаў.

Спадзяюся, што нашы сумесныя намаганні і надалей будуць спрыяць паспяховаму развіццю палітычнага дыялогу, канструктыўнаму партнёрству ў міжнародных арганізацыях, разам з тым дазволяць у поўнай меры задзейнічаць вялікі патэнцыял узаемавыгаднага беларуска-карэйскага супрацоўніцтва ў гандлёвай, інвестыцыйнай, гуманітарнай, турыстычнай, і многіх іншых галінах.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, мае шчырыя пажаданні здароўя і поспехаў, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей